*Л. А. Дзямешка*

# КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ СПАДЧЫНА БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

На падставе вывучэння дакументаў і даследчых матэрыялаў у артыкуле вызначаюцца этапы, кірункі, формы распаўсюджання багатай культурна-асветніцкай спадчыны бібліятэк Беларусі, непарыўна звязаныя з развіццём грамадства. Гістарычны перыяд, прааналізаваны ў артыкуле, ахоплівае другую палову XIX – першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

Багатая культурна-асветніцкая спадчына, якая з’яўляецца здабыткам нашай сучаснай культуры, захоўвалася ў бібліятэках з даўніх часоў. Яна заўсёды была звязаны з прагрэсіўнымі плынямі інкультурацыі, асветніцтва, адукацыі народа. Ідэі стварэння, захавання і распаўсюджання гэтай спадчыны падтрымлівалі прадстаўнікі духавенства. Дзякуючы ім да нас дайшлі найстарэйшыя помнікі пісьменнасці – Астрамірава і Тураўскае евангеліі (XI ст.).

У 1128 г. у Спаса-Ефрасіньеўскім жаночым манастыры, заснаваным Ефрасінняй Полацкай, прападобная Ефрасіння не толькі перапісвала і множыла рукапісныя кнігі і летапісы, але і зберагала іх дзеля будучыні, ратавала ад забыцця. У храме-царкве Свята-Багаяўленскага Куцеінскага мужчынскага манастыра ў 1624 г. дзейнічала тыпаграфія кнігадрукара Спірыдона Собаля, выданні якой распаўсюджваліся сярод духавенства. З вялікім гонарам гаварыў знакаміты Мікола Гусоўскі ў бессмяротнай паэме «Песня пра зубра» пра кнігі славянскія, граматы рускія, якія складаюць культурна-асветніцкую спадчыну народа.

У Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага і іншых беларускіх асветнікаў заўсёды было жаданне захаваць і данесці духоўныя каштоўнасці для нашчадкаў. У культурна-асветніцкую місію спадчыны верыў беларускі паэт Андрэй Рымша, які ў паэме «Дзесяцігадовая аповесць пра ваенныя справы Крыштофа Радзівіла» (1585) клапаціўся за працяг і перспектыву ідэй асветніцтва сярод будучых пакаленняў.

У Сярэднявеччы і пазней духоўную спадчыну стараліся зберагчы бібліятэкі. Менавіта ў манастырскіх бібліятэках – вытокі пісьменства, летапісання, кнігадрукавання, выяўленчага мастацтва, адукацыі, медыцыны, навукі, земляробства беларускай зямлі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У XVI–XVII стст. бібліятэкі існавалі пры праваслаўных брацтвах у Мінску, Вільні, Магілёве, Полацку і Віцебску. Вядомыя таксама прыватныя кнігазборы Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў, Храптовічаў. Духоўныя скарбы (кнігі і іншыя друкаваныя і рукапісныя творы) станавіліся здабыткам у асветніцтве грамадзян. Але шматлікія войны і рэлігійная нецярпімасць з'явіліся першапрычынамі знішчэння беларускіх кніг і беларускіх рукапісаў. Многа разоў згаралі беларускія гарады, мястэчкі і вёскі, а разам з імі і кнігазборы бібліятэк. Так, тысячы рукапісаў і летапісаў спалены ў Вільні падчас пажараў у 1581 г. Нашчэнт знішчана шматтысячная бібліятэка рэдкіх кніг, сабраная ў канцы XVIII ст. у Шчорсах – маёнтку Храповіча [1, с.324–325] Мноства бібліятэчных фондаў вывозілася ворагамі і асядала на абшарах іншых дзяржаў (Германіі, Польшчы, Швецыі, Расіі). А падчас Другой сусветнай вайны на Беларусі цалкам знішчана 219 бібліятэк; тысячы бібліятэк страцілі свае калекцыі. Толькі з Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі было вывезена каля 1 млн 700 тыс. тамоў (83% ад агульнага аб'ёму яе фондаў). Да цяперашняга часу каля 1 млн выданняў не знойдзена, сярод іх – рукапісы, старадрукаваныя і рэдкія выданні [2, с.65–66].

Нягледзячы на спусташальныя войны і непрыязь ворагаў, супрацоўнікі манастырскіх, прыватных, а пазней і грамадскіх бібліятэк працягвалі працу па збіранні, захаванні і распаўсюджанні духоўнай спадчыны сярод грамадзян. Асабліва гэтая праца актывізалася ў XIX ст., што звязана з працэсам адкрыцця бібліятэк пры навучальных установах: пры Полацкай езуіцкай акадэміі, Слуцкай вышэйшай пратэстанцкай школе, пры Нясвіжскім ліцэі, пры народных вучылішчах Віленскай навучальнай акругі. Асветніцкую працу вялі і прыватныя бібліятэкі Т. Нарбута, І. Даніловіча, А. Кіркора, Ю. Бергеля.

У 2-й палове XIX ст. адкрываюцца публічныя бібліятэкі ў Гродні (1830), Магілёве (1833), Віцебску (1857). Штуршок гэтаму працэсу далі грамадскія рэформы і ідэі народніцтва ў Расіі. Распаўсюджваецца філасофія і ідэалогія асветніцтва народа. На грамадскіх пачатках і пры падтрымцы мецэнатаў ствараюцца школы для дарослых, прыватныя гімназіі, народныя бібліятэкі. Сапраўды народнымі сталі Паўленкаўскія бібліятэкі, якія ствараліся на сродкі прагрэсіўнага выдаўца. Вялікую асветніцкую працу выконвала бібліятэка ім. Ф. Ф. Паўленкава ў в. Астрамечава (Брэсцкі р-н), якая была заснавана ў 1905 г. Бібліятэкарам працаваў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

настаўнік Астрамечанскага народнага вучылішча А. П. Занкевіч. Ён падтрымліваў цесныя сувязі з Я. Купалам, з М. Горкім. Дзякуючы ім у фондах бібліятэкі былі выданні суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца», творы многіх рускіх пісьменнікаў. У 1908 г. бібліятэка мела ўжо больш за 1 000 кніг і вяла культурна-асветніцкую работу сярод 240 чытачоў – жыхароў вёскі [1, с.327].

Па ініцытыве беларускай інтэлегенцыі ствараюцца шматлікія таварыствы: Гродзенскае педагагічнае таварыства і Слонімскае таварыства па распаўсюджанні асветы сярод жыхароў г. Слоніма і яго павета (1907), Слуцкае таварыства адукацыі (1909), Таварыства Полацкай бібліятэкі (1912), Віцебскае Таварыства адукацыі (1913) [3].

Пры праяўленнях таварystваў адкрываліся цэнтральныя бібліятэкі, якія праводзілі работу ў народных дамах, пабудаваных у вёсках на грамадскія сродкі і ўтрамліваючых бібліятэкі-чытальні. Цэнтральныя бібліятэкі набывалі кнігі беларускіх, польскіх, расійскіх, украінскіх аўтараў у Вільні, Гродна, Навагрудку, Слоніме; дастаўлялі літаратуру і абсталяванне ў бібліятэкі-чытальні; сумесна з імі ладзілі чыткі, гутаркі, спектаклі; арганізоўвалі курсы для непісьменных, бо 50% насельніцтва Беларусі было непісьменным.

Характэрна дзейнасць Гродненскага педагагічнага таварыства, якое арганізавала ў 1913 г. агульна-адукацыйны музей і цэнтральную бібліятэку, дзе праходзілі чыткі педагагічнага і навуковага характару. Бібліятэкары дапамагалі ў падрыхтоўцы тэм для чытання, у пошуку лектараў, праводзілі вечарыны цікавых сустрэч, афармлялі выставы. З удзелам бібліятэкараў таварыства выдала 13 нумароў часопіса «Педагагічная справа», які меў вялікую культурную і грамадскую значнасць. Пад яго ўплывам стала выдавацца мясцовая газета «Наша раніца», паведамленні ў якой прысвячаліся і дзейнасці бібліятэк [4].

Вялікую культурна-асветніцкую спадчыну несла ў народ Таварыства Полацкай бібліятэкі. Яно дзейнічала на сродкі з уступных членскіх узносаў і на ахвяраванні розных асоб [5]. Таварыства карысталася вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва, а галоўнымі формамі абслугоўвання былі вечарыны: сямейныя, музычныя, літаратурна-драматычныя; спектаклі, лекцыі і канцэрты; маскарады, латэрэі, кірмашы, розныя гульні. Адным з кірункаў дзейнасці Таварыства было асветніцтва і адукацыя дзяцей і моладзі. На сямейных вечарынах абмяркоўваліся творы вядомай беларускай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

пісьменніцы Цёткі, якая стварыла для дзяцей «Лемантар», «Першае чытанне для дзетак беларусаў», «Гасцінец для малых дзяцей». Полацкая бібліятэка рэгулярна ладзіла выставы матэрыялаў, надрукаваных у першым беларускім часопісе для дзяцей і юнацтва «Лучынка», у прыватнасці артыкулы рэдактара часопіса Ядвігіна Ш.; выступленні на старонках часопіса Цёткі – «Аб душы маладзёжнай», «Папараць-кветка», «Шануйце роднае слова»; паэму-казку для дзяцей М.Багдановіча «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык». Вялікая ўвага надавалася хрэстаматыі Я. Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», у якой аўтар ставіў пытанне аб самастойнасці мыслення дзяцей, выпрацоўцы ў іх свайго погляду на з’явы, выхаванні высокіх грамадскіх і эстэтычных ідэалаў.

Па сутнасці, дзейнасць Полацкай бібліятэкі садзейнічала рэалізацыі ідэі адукацыі дзяцей і моладзі на роднай мове, была каштоўным укладам у развіццё нацыянальнай асветніцкай думкі на дэмакратычных асновах, якую распрацоўвалі передавыя педагогі і асветнікі Беларусі Д. А. Сцяпура, К. І. Ціхаміраў, Ф. А. Кудрынскі, Е. Р. Раманаў [6].

Увогуле пры ўсіх таварыствах актыўна працавалі бібліятэкі, якія ўліваліся ў беларускае дэмакратычнае жыццё. Бібліятэкары ажыццяўляюць культурна-асветніцкую дзейнасць разам з настаўнікамі, ладзяць театральныя пастаноўкі твораў В. І. Дуніна-Марцінкевіча «Шчароўскія дажынкі», «Пінская шляхта», «Гапон»; Ф. Аляхновіча «Чырвоныя кветкі Беларусі», «Наталка»; Я. Купалы «Раскіданае гняздо», «Паўлінка». Частымі гасцямі ў бібліятэках былі У. Галубок, Зоська Верас, Ядвігін Ш., С. Рак-Міхайлоўскі, А. Уласаў, першая выканаўца ролі Паўлінкі П. Мядзелка.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі на некаторы час актывізаваўся працэс нацынальнага адраджэння; яно паступова набірае новы размах. Ствараюцца і дзейнічаюць культурна-асветніцкія таварыствы: «Папараць-кветка» ў Слуцку (1918), «Айчына» ў Віцебску (1922), «Далоў непісьменнасць» у Горках (1923).

У складзе Слуцкага таварыства «Папараць-кветка» бібліятэкі забяспечвалі дзейнасць трох секцый: літаратурнай, краязнаўчай і драматычнай і двух філій – «Крыніца» ў в. Старыца і «Зорка» ў в. Ліпнікі. Галоўнымі формамі абслугоўвання насельніцтва былі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

сустрэчы з дзеячамі культуры і мастацтва, семінары, экскурсіі, гурткі для непісьменных, публічныя чытанні, спектаклі.

Абавязкамі бібліятэк, якія існавалі пры таварыствах, была арганізацыя кніжных сховішчаў, наладжванне выстаў, правядзенне заняткаў сярод непісьменных грамадзян, запрашэнні на мерапрыемствы знакамітых асоб.

Культурна-асветніцкія і педагагічныя таварыствы спрыялі арганізацыі сеткі сапраўды народных бібліятэк. Толькі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1928 г. працавала 130 народных бібліятэк-чытальняў [7, с.116]. Работу іх у асноўным курыравалі Гродзенскае педагагічнае і Баранавіцкае культурна-асветніцкае таварыствы, што ўплывала на кірункі і змест дзейнасці бібліятэк. Бібліятэкі ў Гродне, Бабруйску і Віцебску займаліся падтрымкай школ, распаўсюджваннем брашур, кніг, газет і часопісаў, пры магчымасці прадастаўлялі свае памяшканні і зачастую самі ўдзельнічалі ў спектаклях вандроўных тэатраў.

Асаблівай папулярнасцю ў народзе карыстаўся Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр У. Галубка. Захаваліся ўспаміны аб дзейнасці гэтага тэатра, які з 1922 па 1928 г. вандраваў літаральна па ўсёй краіне, ставіў спектаклі ў хатах-чытальнях, у рабочых клубах, гумнах, аборах, пажарных пунях. Сувязь гэтага тэатра з хатамі-чытальнямі ў глухіх беларускіх селішчах была непарыўнай, бо існавала агульная мэта – несці культурна-асветніцкую спадчыну ў народ, спрыяць яго адукацыі і выхаванню. П’есы У. Галубка «Ганка», «Падкідыш», «Суд», «Апошняе спатканне», «Бязвінная кроў», «Жаніхі», «Мужыцкае шчасце» знаходзілі прытулак у фондах хат-чытальняў. Яны асабліва прапагандаваліся перад прыездам артыстаў, бібліятэкары рабілі іх выставы, праводзілі гутаркі; асаблівую ўвагу надавалі беларускаму слову, якое было ва ўжытку і на вечарынах, і ў штодзённым абыходжанні. Да таго ж, разлічаныя на невялікую колькасць выканаўцаў, п’есы У. Галубка выкарыстоўваліся ў самадзейнасці, дзе артыстамі выступалі настаўнікі, вучні, бібліятэкары. Цікавы такі факт: самадзейны школьны тэатр з удзелам бібліятэкара ў в. Цімкавічы (на Міншчыне) на Рэспубліканскім аглядзе самадзейнасці атрымаў пачэснае званне народнага тэатра менавіта за пастаноўку п’есы У. Галубка «Ганка» [8, с.12].

На вялікім адраджэнскім уздыме былі праведзены І Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (1924) і І Усебеларускі краязнаўчы з’езд (1925). Бібліятэкі Беларусі актыўна падтрымалі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

зварот Цэнтральнага бюро краязнаўства да студэнцкай моладзі пад заклікам «Студэнт, пазнай свой край». Яны ладзілі выставы твораў па краязнаўстве пісьменнікаў, фотамайстроў і мастакоў, праводзілі чытацкія канферэнцыі па матэрыялах часопіса «Наш край», складалі спісы крыніц для моладзі. Бібліятэкары разам з передавымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі ідуць «у народ».

Сярод насельніцтва асаблівай папулярнасцю карысталася творчасць членаў літаратурных аб’яднанняў «Маладняк», «Узвышша», якія згуртоўвалі маладыя літаратурныя сілы краіны і выдавалі аднайменныя часопісы [9]. Філіі іх былі створаны ў Віцебску, Магілёве, Полацку, Бабруйску, Гомелі, Слуцку, Оршы, Барысаве, Клімавічах, Мазыры; гурткі і студыі існавалі пры бібліятэках навучальных культурна-асветных устаноў і на прадпрыемствах. Безумоўна, распаўсюджанню літаратурнай спадчыны пісьменнікаў спрыялі бібліятэкі і хаты-чытальні, якіх у той час на тэрыторыі Беларусі налічвалася 7 255 [7, с.325]. Гэта было ўсеагульнае асветніцтва грамадства, асабліва моладзі. Паўсюдна бібліятэкі арганізоўвалі сустрэчы пісьменнікаў з жыхарамі гарадоў, вёсак, мястэчкаў. Галоўнай мэтай такіх вечарын была прапаганда творчасці членаў аб’яднанняў і выяўленне маладых талентаў з асяроддзя рабочых і сялян. Сапраўдным святам моладзі лічылася знаёмства з рэдактарамі «Узвышша» А. Александровічам, П. Галавачом, А. Вольскім, А. Дударам, М. Чаротам; з супрацоўнікамі «Узвышша» К. Чорным, З. Бядуляй, Г. Глебкам, К. Крапівой, С. Дарожным, М. Лужаніным, Я. Пушчай, А. Бабарэкам. Многім карыстальнікам бібліятэк яны адкрылі шлях у прафесійную літаратуру. Часта наведвалі родныя мясціны П. Трус, П. Глебка, К. Чорны, К. Крапіва, імёны якіх на сучасны момант носяць бібліятэкі, у тым ліку і на іх малой радзіме.

Значнай падзеяй у жыцці бібліятэк становіцца I Усебеларускі з’езд работнікаў хат-чытальняў (1927). Ён вырашае пытанне аб паглыбленні працы актыва чытачоў у вёсцы, аб адраджэнні нацыянальнай палітыкі ў абласцях. У наступныя гады прымаюцца дырэктыўныя пастановы «Аб бібліятэчным паходзе», «Аб уключэнні ва Усесаюзны конкурс на лепшую пастаноўку бібліятэчнай работы ў вёсцы». Газета «Чырвоная змена» надрукавала 6 спецвыпускаў «Бюлетэня конкурсу на лепшую сельскую бібліятэку». На старонках газеты выступіў Я. Купала з артыкулам «За бібліятэкі, дастойныя нашай калгаснай вёскі», у якім

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

падымае пытанне аб павышэнні кваліфікацыі бібліятэкараў і аб культурна-асветніцкай рабоце сярод сялян [10, с.273]. У выніку конкурсу ў 43 раёнах былі адкрыты 537 новых бібліятэк, а ў калгасах і саўгасах сталі працаваць 333 бібліятэкі-перасоўкі [7, с.236].

Такім чынам, у першыя дзесяцігоддзі XX ст. бібліятэкі працавалі пад эгідай беларускіх культурна-асветных і педагагічных таварыстваў, назапашвалі і прапагандавалі бібліятэчныя фонды, развівалі ідэі нацыянальнага адраджэння, удасканальвалі формы і метады абслугоўвання, выконвалі значную ролю ў ліквідацыі непісьменнасці, у павышэнні адукацыйнага і культурнага ўзроўню грамадства. Іх культурна-асветніцкая спадчына выконвала гуманістычную і глыбока патрыятычную місію.

З 30-х гг. пачынаецца перыяд згортвання нацыянальнага адраджэння.

У 1931 гг. ЦК камуністычнай партыі Беларусі прымае пастанову «Аб узмацненні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытанні». Ідэі і справы беларускай інтэлігенцыі акрэсліваюцца сталінскай сістэмай як «нацдэмаўшчына». Краязнаўчыя фонды бібліятэк знішчаюцца і выводзяцца з чытацкага ўжытку. Бібліятэкі вымушаны стаць ідэалагічнымі ўстановамі; іх культурна-асветніцкая дзейнасць надоўга спыняецца.

Гэта ўжо іншы перыяд, які чакае свайго даследавання і асэнсавання.

---


*1. Беларуская* Савецкая Энцыклапедыя: у 12 т. – Мн., 1969. – Т.2. – 639 с.

*2. Шышкін, У. А.* Бібліятэкі Беларусі / У. А. Шышкін // Беларуская культура сёння. – Мн.: Мін-ва культуры РБ, 2007. – С. 62–67.

*3. Бацяеў, В. Ф.* Узнікненне і развіццё беларускіх асветніцкіх грамадскіх аб'яднанняў у першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя / В. Ф. Бацяеў // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – №4. – С. 45–50.

*4. Пазашкольная* асвета. Культурна-асветніцкая праца ў гуртках Таварыства беларускай школы. – Вільна, 1928. – 15 с.

*5. Устав* Общества Полоцкой библиотеки. – Полоцк: Типография Н. А. Сомовича, 1912. – 14 с.

*6. Бандарчык, В.К.* Еўдакім Раманавіч Раманаў / В. К. Бандарчык. – Мн., 1961. – 130 с.; *Семяновіч, А.* Настаўнік народнага паэта (Ф. А. Кудрынскі) / А. Семяновіч // Полымя. – 1959. – № 8. – С. 7–8.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ

7. *Библиотечное* дело в БССР: документы и материалы 1918–1941. – Мн.: Выш. шк., 1978. – 367 с.

8. *Адхінуўшы* заслоны часу… Успаміны пра Уладзіслава Галубка. – Мн.: Маст. літ-ра, 1979. – 125 с.

9. *Гілевіч, Н. С.* Акрыленая рэвалюцыяй (Паэзія «Маладняка») / Н. С. Гілевіч. – Мн.: Дзярж. выд. БССР, 1962. – 113 с.

10. *Купала, Я.* За бібліятэкі, дастойныя нашай калгаснай вёскі // Я. Купала. Зб. твораў: у 7 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1976. – Т. 7. – 694 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ